УДК 947.608.42

З.А. КАНСТАНЦІНАВА

# АБЛВЫКАМЗАХ І ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСАЎ ПАСЛЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Беларусь у пачатку XX ст. уяўляла сабой невялікую тэрыторыю, на якой сканцэнтравалася даволі значная колькасць розных нацыянальнасцей. Да рэвалюцый 1917 г. іх інтарэсы вышэйшай уладай ігнараваліся і падаўляліся. Часовы ўрад разам са згодніцкімі партыямі не здолеў вырашыць нацыянальнае пытанне да задавальнення ўсіх прыгнечаных нацый. Найбольш радыкальна вырашалася гэта праблема ў праграме РСДРП(б). Адразу пасля прыходу да ўлады ў 1917 г. Савет Народных Камісараў прыняў Дэкларацыю правоў народаў Расіі, якая прадугледжвала самавызначэнне нацый аж да поўнага аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў [1, с. 40]. Для вырашэння асобных пытанняў, звязаных з жыццём нацыянальнасцей на мясцовым узроўні, у складзе выканаўчых камітэтаў звычайна ўтвараліся нацыянальныя аддзелы.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўладу ў Заходняй вобласці і на Заходнім фронце ўзяў у свае рукі Ваенна-Рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняга фронта. Яго загадам № 5 стваралася пасада камісара ВРК па зносінах з усімі польскімі грамадскімі, грамадзянскімі, ваеннымі арганізацыямі і ўстановамі [2; ф.60, воп.3, спр.260, л.122]. Ва ўтвораным пастаянным савецкім органе ўлады – Абласным выканаўчым камітэце Заходняй вобласці і фронта (Аблвыкамзах, ці АВК) – сярод іншых быў арганізаваны камісарыят па нацыянальных справах [3, с. 294]. Узначаліў яго С.І. Берсан; штат аддзела першапачаткова складаўся з чатырох асоб, трое з якіх належылі да партыі бальшавікоў [4, с. 4].

У канцы снежня 1917 г. быў абнародаваны загад народнага камісара па нацыянальных справах Заходняй вобласці і фронта аб арганізацыі асобнага камісарыята па польскіх справах. Афіцыйна ў яго распараджэнні павінны былі знаходзіцца дзяржаўныя і грамадскія ўстановы, якія былі эвакуіраваны з Польшчы, установы для патрэб бежанцаў, а таксама ўсе вайсковыя справы жыхароў царства Польскага [3, с. 643]. У зборніку дакументаў «Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии» тлумачыцца гэты факт такім чынам: "Камісарыят па польскіх справах быў створаны ў сувязі з тым, што на тэрыторыі Заходняй вобласці пражывала шмат палякаў-бежанцаў і знаходзіліся польскія войскі" [3, с. 959].

Гэта тлумачэнне выглядае непераканаўчым, бо ўсё вышэй сказанае можна аднесці і да ўкраінцаў. Не кажучы ўжо пра беларусаў, чыі нацыянальныя інтарэсы

ў Заходняй вобласці павінны былі мець перавагу. Справа ў тым, што да моманту Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі дыслацыраваўся дваццацідзевяцітысячны I Польскі корпус пад камандваннем генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага. Корпус не прызнаваў савецкую ўладу, адмаўляўся праводзіць дэмакратызацыю. Легіянеры бязлітасна распраўляліся з тымі, хто быў западозраны імі ў рэвалюцыйных выступленнях. Яны перашкаджалі пераходу зямлі да сялян, самавольна рэквізавалі хлеб, фураж, жывёлу [5, с. 48-49]. На тэрыторыі, занятай корпусам, разгортваўся партызанскі рух. Для барацьбы з ім польскія легіянеры праводзілі карныя аперацыі супраць сялян [2; ф.60, воп.3, спр.352, л.68].

Хаця ў канцы 1917 г. корпус Доўбар-Мусніцкага яшчэ не вёў супраць Савецкай Расіі баявых дзеянняў [5, с. 50], тым не менш польскі вайсковы рух пагражаў выліцца ў моцную антысавецкую хвалю. Прапаганда і праца сярод палякаў давала магчымасць бальшавікам перацягнуць хаця б частку іх на свой бок. Пры гэтым беларускі нацыянальны рух кіраўнікі Аблвыкамзаха яўна недаацэньвалі. Н.В. Крыленка і А.Ф. Мяснікоў заяўлялі, што яны беларускага руху не бачаць і не адчуваюць [2; ф.60, воп.3, спр.338, л.45]. Такая пазіцыя і стала ў далейшым асноўным прынцыпам нацыянальнай палітыкі Аблвыкамзаха, яго ўзаемаадносін з прадстаўнікамі беларускіх нацыянальных сілаў.

У лютым 1918 г. нямецкае камандванне разгарнула наступленне па ўсяму фронту, і вымушаная эвакуацыя савецкіх органаў ў Смаленск прывяла да рэарганізацыі Аблвыкамзаха, якая адбылася на так званым II з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці (красавік 1918 г.). Сярод іншых рашэнняў з'езд вызначыў сістэму пабудовы цэнтральнай улады ў Заходняй вобласці. Паводле яе, пададдзел па справах нацыянальнасцей разам з пададдзелам па справах бежанцаў з'яўляліся структурнымі адзінкамі аддзела ўнутраных спраў [2; ф.35, воп.1, спр.44, л.231]. Сфера кампетэнцыі нацыянальнага пададдзела – справы, што тычацца жыцця розных нацыянальнасцяў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Заходняй вобласці (Мінская, Магілёўская, Віцебская і Смаленская губерніі). Меркавалася, што нацыянальны пададдзел будзе падраздяляцца на беларускую, польскую, яўрэйскую, літоўскую і латышскую секцыі.

17 красавіка 1918 г. загадчык нацыянальным пададдзелам С.І. Берсан звярнуўся ў Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) з прапановай яго прадстаўніку ўзначаліць беларускую секцыю, а таксама «прысылаць у гэты аддзел усе распараджэнні, якія тычацца нацыянальных пытанняў» [2; ф.4, воп.1, спр.16, л.1]. 22 мая 1918 г. камісар Белнацкама А.Р. Чарвякоў прызначыў загадчыкам Смаленскага (Заходне-Абласнога) аддзела Ф.Г. Шантыра, які прыбыў у Маскву з акупіраванай часткі Беларусі. Меркавалася, што Смаленскі аддзел Белнацкама адначасова будзе з'яўляцца беларускай секцыяй нацыянальнага пададдзела Заходняй вобласці [6, с. 60]. Падобная практыка была шырока распаўсюджана. Для вядзення працы сярод насельніцтва нацыянальныя камісарыяты мелі філіялы (аддзяленні) на месцах, арганізоўвалі нацыянальныя камісарыяты пры абласных, губернскіх і павятовых Саветах і выканаўчых камітэтах Саветаў [6, с. 49].

На момант адкрыцця Смаленскага Белнацкам меў ужо некалькі аддзяленняў. Адно (у Петраградзе) ўтварылася ў сувязі з яго пераездам у канцы сакавіка ў Маскву. У чэрвені яно было пераўтворана ў Беларускі аддзел Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза Камун Паўночнай вобласці. У канцы сакавіка арганізавана аддзяленне ў Віцебску. У лістападзе – Саратаўскі філіял [6, с. 59-61]. У канцы 1918 г. меркавалася адчыніць яшчэ адно – у Мсціслаўлі (Магілёўская губерня) [2; ф.4, воп.1, спр.16, л.10].

Аддзяленні камісарыята часта сустракаліся з непаразуменнем з боку мясцовых улад. Прадстаўнік Белнацкама Ф. Шантыр у сваёй арганізацыйнай працы,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

наадварот, не сустрэў ніякіх перашкод з боку кіраўнікоў Аблвыкамзаха. Для аддзела было адведзена памяшканне, таксама вырашаны некаторыя іншыя гаспадарчыя пытанні. Па прапанове С. Берсана Шантырам быў складзены праект штатаў аддзела і запрошаны на пасады работнікі [2; ф.4, воп.1, спр.16, л.10].

Пасля завяршэння папярэдніх работ 30 мая 1918 г. адбылося адкрыццё Заходне-Абласнога аддзялення Белнацкама і, адпаведна, пададдзела АВК. Аб чым было абодвум афіцыйна паведамлена. Рэакцыя апошняга была нечаканай, «таму што ваша прызначэнне (Ф. Шантыра) загадчыкам гэтага аддзела не зацверджана яшчэ мясцовымі органамі савецкай улады, то і Заходне-Абласны аддзел Беларускага камісарыята нельга лічыць сканструяваным і прызнаць паўнамоцтваў яго дзеянняў...». Далей прадпісвалася аддзяленню спыніць усю афіцыйную перапіску ад імя ўстаноў Заходняй вобласці да канчатковага вырашэння Аблвыкамзахам пытання аб яго існаванні. Абласны Паўночна-Заходні камітэт РКП(б) выказаўся па дадзенаму пытанню адмоўна. Адпаведнае рашэнне было вынесена на пленарным пасяджэнні АВК 10 чэрвеня 1918 г. [2; ф.16, воп.1, спр.16, лл.9-13].

Смаленскі аддзел вымушаны быў часова прыпыніць працу, для аднаўлення якой магчыма была яго рэарганізацыя толькі ў якасці філіяльнага аддзялення Беларускага камісарыята. Для высвятлення абставін ліквідацыі нацыянальнага пададдзела ў Смаленск быў пасланы прадстаўнік Белнацкама, які сустрэўся са старшынёй Аблвыкамзаха і атрымаў ад яго тлумачэнні. Той заявіў, што нацыянальныя аддзелы ўносяць разлад у працу краёвай савецкай улады. Таму яны непатрэбны, тым больш што савецкая ўлада цалкам ахоўвае інтарэсы асобных нацыянальнасцяў. Існаванне ў Смаленску розных афіцыйных аддзелаў па нацыянальных справах можа выклікаць нацыянальную варожасць, «... у Смаленску не можа быць месца ніякім нацыянальным арганізацыям, і Аблвыкамзах не дапусціць іх існавання. Увогуле, у Смаленску не можа быць месца нічому беларускаму, бо гэта сыграла бы на руку немцам, якія імкнуцца «самавызначыць» усю Беларусь.» Член Аблвыкамзаха, які таксама прысутнічаў пры размове, заявіў, што Смаленск – не беларускі горад, і што, увогуле, ніякай Беларусі няма [2; ф.16, воп.1, спр.16, лл.22-23].

У дадзенай сітуацыі дзеянні Аблвыкамзаха выглядаюць дастаткова нелагічнымі. Але трэба прыняць да ўвагі, што рашэнне аб утварэнні нацыянальнага аддзела было прынята на II з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці, які толькі вылучыў са свайго складу Абласны выканаўчы камітэт. У працы гэтага з'езда прымалі ўдзел прадстаўнікі нацыянальных арганізацый. Газета «Звезда», якая выходзіла ў Смаленску, 13 красавіка змясціла паведамленне аб прыездзе А. Чарвякова [6, с. 60]. Акрамя гэтага, адкрытае ігнараванне інтарэсаў нацыянальнасцей у момант канфрантацыі з Радай БНР магло павысіць маральны аўтарытэт апошняй. Такім чынам, стварэнне нацыянальнага аддзела і запрашэнне да супрацоўніцтва нацыянальных арганізацый з боку Аблвыкамзаха было толькі дэкларатыўнай мерай. А сама асоба камісара (Ф. Шантыр – удзельнік Усебеларускага з'езда) і праяўленая ім актыўнасць (арганізаваў у Смаленску сход, на якім меркавалася стварыць беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў і інш.) не ўпісваліся ў агульную накіраванасць нацыянальнай палітыкі, якую праводзіў Паўночна-Заходні камітэт РКП(б) у Заходняй вобласці [7, с. 193].

Многія партыйныя і савецкія кіраўнікі Заходняй вобласці стаялі на пазіцыі нацыянальнага нігілізму, якая атрымала яскравае адлюстраванне ў агульнавядомых артыкулах сакратара Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) В. Кнорына [8, с. 320]. Падобныя погляды былі заснаваны на папулярнай ідэі інтэрнацыяналізму, і не адпавядалі тагачаснай афіцыйнай палітыцы Камуністычнай партыі ў нацыянальным пытанні. У ліпені 1918 г. Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт звярнуўся да ўсіх губернскіх Саветаў з радыётэлеграмай, якая змяшчала

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

просьбу «аказваць усялякае садзейнічанне Народнаму камісарыяту па справах нацыянальнасцей і існуючым пры ім асобным нацыянальным камісарыятам у справе па арганізацыі аддзелаў нацыянальных камісарыятаў у правінцыі». Пазней Наркамнац прыняў інструкцыю аб нацыянальных аддзелах пры Саветах. У гэтым дакуменце ўказвалася, што аддзелы па справах нацынальнасцей пры Саветах ствараюцца на роўных з другімі аддзеламі правах [8, с. 304].

Бесцырымоннасць і знявага, з якой абышоўся Аблвыкамзах з другім савецкім органам, можна растлумачыць крызісным момантам, які на той час перажываў Белнацкам. Спецыяльная камісія Народнага камісарыята нацыянальнасцей у канцы красавіка 1918 г. абследавала працу Белнацкама. Яму было пастаўлена ў віну, што з прычыны недахопу вопытных кадраў агітацыйна-палітычная работа разгортвалася павольна, і калегія Наркамнаца прыняла рашэнне ўстанавіць кантроль над Белнацкамам. У канцы ліпеня 1918 г. гэты кантроль быў зняты, і ён ураўнаваны з іншымі камісарыятамі [6, с. 61].

На аб'яднаным пасяджэнні Савета Белнацкама з выканаўчымі камітэтамі секцыі беларускіх камуністаў і левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў было прызнана неабходным існаванне ў Смаленску аддзела Беларускага камісарыята. Замест Ф. Шантыра камісарам Смаленскага аддзялення Белнацкама 1 ліпеня 1918 г. быў прызначаны Ф.С. Замойскі. Ён і прыступіў у пачатку ліпеня да паўторнай арганізацыі аддзялення [2; ф.4, воп.1, спр.16, лл.20-21]. Адчынілася Смаленскае аддзяленне Белнацкама ў складзе чатырох аддзелаў: упраўлення і канцэлярыі, культурна-асветнага, выдавецкага і агітацыйна-палітычнага і бежанскага [2; ф.4, воп.1, спр.96, л.131].

Аддзяленне адразу актыўна ўзялося за працу. Праводзілася агітацыя і сярод жыхароў Беларусі, і сярод бежанцаў-беларусаў. Чыталіся лекцыі аб Беларусі, рыхтавалася выданне ўласнай газеты «Рунь». Меркавалася, што яна будзе выходзіць 2 разы ў тыдзень. На гэту справу былі атрыманы грошы ад Белнацкама. Было нават падрыхтавана да друку тры нумары газеты. Яе выданне затрымлівалася тым, што мясцовыя савецкія ўлады не давалі дазволу на друк [2; ф.4, воп.1, спр.96, лл.27, 34]. Выпуск газеты так і не ўдалося наладзіць [9, с. 24].

Узаемаадносіны паміж гэтымі двумя (Белнацкам і Аблвыкамзах) савецкім органамі працягвалі заставацца напружанымі. Смаленскае аддзяленне і ў далейшым адчувала процідзеянне сваім планам з боку Аблвыкамзаха. Напрыклад, пасяджэнне абласнога камітэта партыі пастанавіла дэлегацыю Белнацкама не дапусціць на III абласны з'езд Саветаў. Аблвыкамзах выношваў планы па ліквідацыі Смаленскага аддзялення. Меркавалася ўсе існуючыя нацыянальныя камісарыяты ў Заходняй вобласці аб'яднаць і пераўтварыць у нацыянальны пададдзел пры аддзеле ўпраўлення з тым, каб паступова іх знішчыць [2; ф. 59, воп.1, спр.11, л.66, 95]. Сам Белнацкам абвінавачваўся ў нацыянал-шавінізму. Рада БНР і Белнацкам лічыліся родаснымі арганізацыямі, таму што ставілі сваёй мэтай «раздрабленне адзінага рэвалюцыйнага фронту працоўных» [9, с. 24].

Восенню 1918 г. скасаваў мясцовае аддзяленне Белнацкама Віцебскі губернскі выканкам, прычым ліквідацыя адбылася без згоды і кансультацыі з Наркамнацам. Гэтыя незаконныя дзеянні губернскіх улад выклікалі адказную рэакцыю беларускіх секцый РКП(б). Маскоўская і Петраградская секцыі выступілі з афіцыйнымі пратэстамі. У сваёй рэзалюцыі Петраградская секцыя 3 снежня 1918 г. расцаніла дзеянні Віцебскага губвыканкама як палітычна і юрыдычна няправільныя, якія дыскрэдытуюць рэвалюцыйную творчасць у нацыянальным пытанні. Сход дабіваўся адмены пастановы [8, с. 304].

Белнацкам быў заклапочаны будучыняй Беларусі, будаваў планы па рэалізацыі яе права на нацянальнае самавызначэнне. У канцы лета 1918 г. ягоная

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

дзейнасць у гэтым накірунку актывізуецца: ствараюцца розныя праекты будучага ўладкавання Беларусі. Праект дэкрэта аб утварэнні Беларускай вобласці (афіцыйна не зацверджаны Белнацкамам) у першым пункце прадугледжваў уваходжанне Беларускай вобласці ў РСФСР на правах аўтаномнай палітычнай адзінкі, самастойнай у сваім гаспадарчым і адміністрацыйна-палітычным жыцці. Пытанне аб уладзе павінен быў вырашыць Усебеларускі ўстаноўчы сход. Пасля сканструявання на ім вышэйшых органаў Беларускай вобласці спыняліся паўнамоцтвы выканаўчага камітэта Заходняй вобласці. Складальнікі праекта лічылі, што Аблвыкамзах узнік выключна з вайсковай арганізацыі Заходняга фронту «без волявыяўлення самога зацікаўленага насельніцтва вобласці» [10, с. 59].

Шырока вядома спроба Белнацкама перайменаваць Заходнюю вобласць у Беларуска-Літоўскую. Хаця яна і не мела пад сабой на той момант рэальных гістарычных падстаў (акупацыя часткі Беларусі, волевыяўленне літоўскага народа) [8, с. 322], але магла мець сімвалічнае значэнне. Гэта пытанне, як урэшце і астатнія, спачатку разглядалася на пасяджэнні Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б). Прапанова Белнацкама была рашуча адхілена, затое падтрымалася ініцыятыва аб перайменаванніі Заходняй вобласці ў Заходнюю Камуну [2; ф.60, воп.3, спр.368, л.9]. Праект Беларуска-Літоўскай вобласці нават не быў унесены на разгляд III з'езда Саветаў Заходняй воласці [6, с. 94]. 31 кастрычніка 1918 г. Народным камісарыятам унутраных спраў афіцыйна была зацверджана новая назва Заходняй вобласці – Заходняя Камуна [10, с. 61].

Няўдача ў супрацоўніцтве з афіцыйнымі органамі ўлады выклікае ў Белнацкама жаданне дабіцца самавызначэння Беларусі іншым шляхам – пашырэннем свайго ўплыву сярод насельніцтва Беларусі. На пасяджэнні калегіі Белнацкама 15 кастрычніка 1918 г. было пастаноўлена дабівацца права рашаючага голасу на пасяджэннях калегіі Наркамнаца, пры гэтым падкрэслівалася тая важная роля, якую павінен іграць Белнацкам у жыцці Беларускага краю [2; ф.4, воп.1, спр.96, л.137].

Працягвала гэту стратэгію I канферэнцыя адказных кіраўнікоў Белнацкама. Канферэнцыя абавязвала ўсіх членаў і супрацоўнікаў камісарыята неадкладна прыступіць да фарміравання рэальных сіл для сусветнай рэвалюцыі на акупіраванай і неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, а менавіта: стварэнне ва ўсіх вёсках, на фабрыках і заводах беларускіх секцый партыйных органаў і прыцягненне ў гэтыя органы ўсяго працоўнага насельніцтва Беларусі. Гэта сведчыць аб імкненні Белнацкама стаць уплывовай палітычнай сілай, з якой будзе вымушаны лічыцца выканаўчы камітэт Заходняй Камуны [10, с. 61].

У пачатку мінулага стагоддзя на абшарах былой Расійскай імперыі палітычная сітуацыя склалася такім чынам, што пытанне нацыянальнага самавызначэння народаў насіла першараднае значэнне. Абяцанне яго вырашыць стала адным з козыраў бальшавіцкай партыі. Нягледзячы на агульны курс Савецкага ўрада, кіраўнікі Заходняй вобласці не звярталі ўвагі на патрабаванні нацыянальнасцей, і з гэтай пазіцыі гатовы былі лічыцца з апошнімі толькі ў выпадку прамой пагрозы з іх боку. Адсюль і складаныя напружаныя ўзаемаадносіны з Белнацкамам, усе імкненні якога па супрацоўніцтву, а потым і па ўзяццю ў свае рукі ініцыятывы ў нацыянальным самавызначэнні Беларусі выкараняліся. Цынічна адмаўляючы існаванне беларускай нацыі, стоячы на памылковым успрыняцці інтэрнацыяналізму, Аблвыкамзах прадстаўляў рэгрэсіўныя сілы, перашкоджваў развіццю натуральнага гістарычнага ходу.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Декреты Советской власти. Сб. док. и мат.: В 13 тт. – М., 1957. – Т. 1.
2. Нацынальны архіў Рэспублікі Беларусь; ф.4, воп.1, спр.16, 96; ф.35, воп.1, спр.44; ф.59, воп.1, спр.11; ф.60, воп.3, спр.260, 338, 352, 368.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

3. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Сб. док. и мат.: В 2 тт. – Мн., 1957. – Т. 2.
4. Советская правда. – 1917. – 5 декабря.
5. Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917 – 1920 / Под ред. И.М. Игнатенко, И.И. Минца. – Мн., 1990.
6. ***Скалабан В.В.*** Белнацком: Дисс. ...канд. ист. наук. 07.00.02. – Минск, 1987.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. – Кн. 2; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш. – Мн., 2003.
8. ***Круталевич В.А.*** Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 – декабрь 1918 гг.). – Мн., 1975.
9. ***Круталевіч В.А., Юхо І.А.*** Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.). – Мн., 2000.
10. ***Башко И.К.*** Из истории деятельности Белорусского национального комиссариата // Путем борьбы и труда. – Мн., 1989. – С. 58-63.

## SUMMARY

*The problem of Belarussian national self-determination after the October Revolution is the subject matter of the article, national policy of the central govemmental body of Soviet Power in Westem Region in 1917 – 1918 (Regional Executive Committee of Westem Region) being in the centre of author's attention as well as the given committee's relations with Belarussian National Comissariat.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова